*14.* Портрет Льва Сапеги [Электронный ресурс] // Национальный исторический музей Республики Беларусь. – Режим доступа: http://histmuseum.by/ru/news/733. – Дата доступа: 27.03.2021.

*15. Пракаповіч, Н. С.* «Беларускі Версаль» [Электронный ресурс] / Н. С. Пракаповіч // Библиотека «Истоки». – Режим доступа: https://sources.ruzhany.info/002.html. – Дата доступа: 29.03.2021.

*16. Саверчанка, І. В.* Канцлер Вялікага Княства : Леў Сапега / І. В. Саверчанка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 63 с. : іл. – (Нашы славутыя землякі) ; Саверченко, И. В. Канцлер Лев Сапега / И. В. Саверченко. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2020. – 64 с. : ил.

*17.* Сапегі: асобы, кар’еры, маёнткі : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларуси, Ін-т гісторыі ; уклад. А. А. Скеп’ян ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск : А. М. Янушкевіч, 2018. – 320 с. : іл.

*18.* Сапегиана: книжное собрание рода Сапег = Сапегіяна: кнігазбор роду Сапегаў [Электронный ресурс] / Нац. б-ка Беларуси, Рос. нац. б-ка ; сост.: Л. Г. Кирюхина, К. В. Суша ; под науч. ред. Н. В. Николаева, Т. И. Рощиной. – Электрон., текст., графич. данные и программа (1,7 Гб). – Минск : НББ, 2011. – 1 электрон. опт. диск (DVD-ROM).

*19. Стычинский, М.* Кризис идентичности: механизмы забвения и мемориализации в условиях глобализации / М. Стычинский // Вопросы философии. – 2020. – № 7. – С. 35–39.

Т. Ф. СУХОЦКАЯ

# КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА РОДУ САПЕГАЎ У ДЗЯРЭЧЫНЕ

Культурная спадчына беларускага народа створана не толькі сялянамі, але і намаганнямі прадстаўнікоў магнацкіх колаў Радзівілаў, Тышкевічаў, Сапегаў, Храптовічаў, Манюшкаў і інш. У пачатку ХХ ст. у Беларусі да актуальнага творчага жыцця далучаецца сялянская інтэлігенцыя. Сумеснымі намаганнямі заснавана сучасная беларуская культура. У ХХ ст. культуратворчую ролю эліты ў беларускай гісторыі рэабілітаваў у сваіх тэкстах Уладзімір Караткевіч (род Загорскіх у рамане «Каласы пад сярпом тваім»). Ролю культурных кланаў у гісторыі беларускага адраджэння ўпершыню ў беларускай прозе паказаў В. Якавенка: у трылогіі «Пакутны век» клопат пра лёс радзіны і Бацькаўшчыны яднае жыццёвыя інтарэсы селяніна Пятра Рамановіча і грамадскага дзеяча з магнацкага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

роду Рамана Скірмунта. Навуковае асэнсаванне культурнай спадчыны магнацкіх родаў як суб'ектаў гісторыі скіравана на захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці, культурнай памяці беларускага народа.

Магнацкі род Сапегаў на Беларусі лічыўся другім па значэнні пасля Радзівілаў. У XV–XVIII стст. яго прадстаўнікі займалі найвышэйшыя дзяржаўна-адміністрацыйныя і ваенныя пасады ў Вялікім Княстве Літоўскім, валодалі многімі гарадамі і мястэчкамі на Беларусі, аднак княжацкі тытул атрымалі толькі ў 1700 г. У канцы XV – пачатку XVII ст. Сапегі перайшлі з праваслаўя (і кальвінізму) у каталіцызм.

Вывучэнню роду дзярэчынскіх Сапегаў прысвечаны навуковыя працы беларускіх даследчыкаў М. Скоблы [4, 5], Т. Габрусь [2], М. Чарняўскага [8], І. Соркінай [7], Н. Сліж [6] і інш. У 2016 г. часопіс «ARCHE» прысвяціў роду Сапегаў цэлы нумар [1]. Своеасаблівую энцыклапедыю Сапегаў стварыў адзін з апошніх прадстаўнікоў роду Яўстах (Астап) Севярын Сапега. У 1995 г. ён выдаў манаграфію «Сапежынскі дом», якая была перакладзена на беларускую мову ў 2017 г. беларускімі вучонымі і выйшла пад назвай «Гісторыя Сапегаў: жыццяпісы, маёнткі, фундацыі» [3]. У ёй сабраны жыццяпісы 85 найбольш выдатных Сапегаў. У кнізе таксама маюцца апісанні 72 сапегаўскіх маёнткаў і фундацый, нарысы па генеалогіі і геральдыцы, спісы пасадаў, якія займалі прадстаўнікі роду, старыя фотаздымкі, гравюры.

Дзярэчынскія Сапегі належаць да ружанскай лініі. Дзярэчын як паселішча прайшоў шлях у сваім развіцці ад маёнтка да графства [6]. Паходзіць назва ад бортніцтва, якое называлася дзярэчай.

На працягу XV – першай паловы XIX ст. Дзярэчын знаходзіўся ва ўласнасці некалькіх родаў. І толькі ў пачатку XVII ст. большая частка маёнтка сканцэнтравалася ў руках Палубінскіх, якім Дзярэчын належаў да канца XVII ст. 22 верасня 1685 г. праз шлюб Ізабелы Алены Палубінскай са стольнікам ВКЛ Юрыем Сапегам Дзярэчын патрапіў да ружанскіх Сапегаў і заставаўся ў іх да канфіскацыі ў 30-х гг. XIX ст.

Культурна-гістарычная спадчына Дзярэчына непарыўна звязана з родам Сапегаў. Яна захавалася да нашых дзён і ва ўспа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мінах жыхароў навакольных вёсак, і ў руінах некалі велічных культурных артэфактаў.

Ужо на самым пачатку XVI ст. у Дзярэчыне існавала царква Святога Спаса. Прыкладна праз стагоддзе пісар Канстанцін Палубінскі заснаваў тут касцёл і кляштар дамініканцаў, пры якім адкрыліся школа, бібліятэка і шпіталь. Дзятлаўскі касцёл фундаваны ў 1624 г. Львом Сапегам, яго сынам Казімірам Львом, пра што сведчыць мемарыяльная дошка ў партале храма. Замест драўлянага касцёла манахі-дамініканцы ў 1690 г. змуравалі цагляны. Перад касцёлам знаходзіліся злева вежа-званіца, справа – гадзіннікавая вежа. У 1743 г. касцёл быў пашкоджаны падчас пажару. Сродкі на аднаўленне бажніцы ахвяраваў Мікалай Фаўстын Радзівіл. Пасля аднаўлення фасад і аздабленне інтэр'ера набываюць рысы віленскага барока. Да касцёла прылягаў пабудаваны ў сярэдзіне XVIII ст. кляштарны будынак.

У 1741 г. касцёл «… быў урачыста асвечаны віленскім біскупам Міхалам Зянковічам як храм Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі» [5]. У гонар нябесных заступнікаў святых Антонія, Тамаша, Вінцэнта і Анёла Ахоўніка ў касцёле створаны мармуровыя каплічкі. Падлога была выслана зялёным мармурам. Інтэр'ер упрыгожаны фрэскамі на біблейскія сюжэты. Стылёвай адметнасцю ўнутранага афармлення было спалучэнне рысаў позняга барока і ракако. Стукавая лепка і разьба па дрэве аздаблялі сем алтароў. Галоўны алтар быў двухярусным, і яго ўпрыгожвалі шэсць дынамічных і эспрэсіўных скульптур святых. У аздабленні інтэр'ера – шмат геральдычных арнаментальных матываў. У 1866 г. касцёл згарэў.

Інтэнсіўнае развіццё Дзярэчына пачынаецца падчас уладарання апошняга канцлера ВКЛ Аляксандра Сапегі. У 1786 г. ён узвёў будынак у стылі класіцызму паводле праекта архітэктараў Я. С. Бекера і Л. С. Гуцэвіча як ваенную навучальную ўстанову («Акадэмія»), заснаваў у канцы XVIII ст. тэатр. У пачатку XIX ст. яго сын Францішак перарабіў будынак на палац і абкружыў яго паркам рэгулярна-тэраснага тыпу («Малы Версаль») з сістэмай ставоў. У палацы была створана багатая карцінная галерэя, археалагічны кабінет і бібліятэка, у якіх размясціліся калекцыі малярства, зброі літоўскіх гетманаў, каштоўнага посуду, ваенных трафеяў, старажытных дакументаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У палацы былі багатыя калекцыі кніг і твораў мастацтва, прывезеных з Ружанаў. Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай паселішча адышло да Расійскай імперыі. У пачатку XX ст. палац перароблены ў вайсковыя казармы (да 1906 г.). У дваццатыя гады мінулага стагоддзя згодна з Рыжскай дамовай Дзярэчын апынуўся пад уладай буржуазнай Польшчы. Палацава-паркавы комплекс знішчаны ў 1920-я – 30-я гг.

Пасля пабудовы палаца ў Дзярэчыне ён стаў галоўнай рэзідэнцыяй Сапегаў, ператварыўся ў даволі буйны маёнтак, чыя сельскагаспадарчая прадукцыя знаходзіла попыт на замежным рынку. У Дзярэчыне дзейнічалі млын, багадзельня, дзве школы, крамы. Штогод ладзіўся вялікі кірмаш. Эканомы, якія кіравалі ўладаннямі Сапегаў, здзяйснялі нагляд над гаспадаркай і падданымі, а іх праца кантралявалася праз сістэму справаздач. Праводзілася не толькі інвентарызацыя, але даваліся дэталёвыя звесткі пра сялян, пра іх штодзённую працу. Складваліся нават некаторыя сялянскія радаводы.

Сапегі былі не толькі выдатнымі гаспадарамі, але і адданымі патрыётамі, марылі здабыць волю для Бацькаўшчыны. Імкнуліся да незалежнасці ВКЛ. Яркай асобай з дзярэчынскіх уладароў быў легендарны Францішак Сапега (28.08.1772, Варшава – 30.05.1829).

Князь нарадзіўся ў Варшаве ў 1772 г. Падчас навучання ў кадэцкім корпусе ў Пулавах яго настаўнікам быў Францішак Ксавэры Богуш, які з'яўляецца аўтарам кнігі «Пра пачатак народу й мовы літоўскай». Ён выпраўляе Францішка на вучобу ў Віленскі ўніверсітэт.

У дваццацігадовым узросце Сапега наведвае Пецярбург. Як удзельнік літоўскай дэлегацыі быў прыняты Кацярынай ІІ. Уражанні ад прыёму пакінулі прыкры след у памяці амбіцыйнага юнака. Ён лічыў, што не вельмі ярка прадэманстраваў сябе перад каранаванай асобай.

У 1793 г. у Гародні Францішак Сапега бярэ шлюб з Пелагеяй Патоцкай. Пасля вяселля маладыя пасяляюцца ў Дзярэчыне, які пераходзіць да яго, як і многія іншыя маёнткі, у спадчыну. Толькі Дзярэчынскі маёнтак даваў 131 000 залатых грашовага прыбытку. Пачынаецца актыўная і плённая гаспадарчая дзейнасць князя Сапегі. У сваіх уладаннях ён будуе цагляны завод,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бровар, сукнавальню, млын, гумны, стайні, асеці. Адкрываецца карчма, рэстарацыя для наведнікаў Зэльвенскага кірмашу.

Свой талент Францішак Сапега паспрабаваў і ў ваеннай справе. У 21 год ён атрымлівае званне генерала артылерыі, заслугоўвае ордэн святога Станіслава. І ў гэты ж час ён удзельнічае ў падрыхтоўцы паўстання 1794 г. Тадэвуш Касцюшка ацаніў здольнасці маладога генерала і прапанаваў яму ўзначаліць збройны выступ на Літве. У Дзярэчыне размяшчалася дывізія колькасцю дзве тысячы жаўнераў, якой кіраваў Францішак.

Добра разумеючы палітычнае становішча ў Расійскай імперыі, імкнучыся захаваць сваю спадчыну, пасля разгрому паўстання Францішак Сапега вымушаны быў напісаць пакаянны ліст да Кацярыны II, даць клятву на вернасць Расіі. Атрымаўшы дараванне за ўдзел у паўстанні, Францішак едзе ў Пецярбург. Вядома, ён быў занепакоены лёсам Тадэвуша Касцюшкі, які адбываў пакаранне ў Петрапаўлаўскай крэпасці. Усе намаганні князя былі скіраваны на вызваленне сябра. У ход пайшлі знаёмствы, сваяцкія сувязі і асабісты талент харызматычнага Сапегі. Толькі праз два гады Касцюшка быў вызвалены. Гэтая падзея сімвалічна адлюстравана ў карціне беларускага мастака Яна Дамеля «Вызваленне Касцюшкі з цямніцы».

У 1796 г. Францішак Сапега ўдзельнічаў у каранацыі Паўла I, што адбывалася ў Маскве. На той час князь зрабіў добрую кар’еру: меў тытулы расейскага тайнага саветніка і маршалка Менскай губерні. Францішку ўдалося завязаць высокае знаёмства з царом. Пацвярджэннем гэтаму можа быць наведванне Паўлам I Дзярэчына. Верагодна, у прыватнай размове з царом князь зноў прасіў літасці да свайго паплечніка і сябра Т. Касцюшкі.

Пасля паражэння паўстання на беларускіх землях пачынаецца цёмная ноч русіфікацыі. Францішак Сапега, зведаўшы пакуты ад стратаў, расчараванне ў сваіх надзеях, вырашае пакінуць Бацькаўшчыну. Пачынаюцца бясконцыя падарожжы па еўрапейскіх сталіцах, дзе ён з галавой акунаецца ў багемнае жыццё. У 1803 г. Францішак Сапега знаёміцца з фаварыткай Напалеона актрысай Маргарытай-Жазэфінай Вэльмэр. Разумеючы рэакцыю Напалеона на такое сяброўства, Францішак



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падчас вайны з французамі палічыў за лепшае адседзецца ў расейскай глыбінцы.

Пасля высылкі Напалеона на востраў Святой Алены князь Сапега вяртаецца ў Еўропу. Пра яго авантурныя падарожжы хадзілі легенды. Нікога не пакідала ў спакоі яго бурнае жыццё. Аднойчы ў Парыжы ён за адну ноч прагуляў у карты пятнаццаць мільёнаў золатам. Аднак князь праводзіў свой час не толькі ў бяздумных забавах. Яго няўрымслівай натуры хацелася пазнаць свет і атрымаць яркія ўражанні. Яму задумалася залезці ў кратар Везувія. Пасля Сапега захапляецца горнымі вяршынямі Пірэней. З сваім сябрам Корвінам Вышкоўскім ён нават трапляе пад снегавыя лавіны. Не пакінула раўнадушным князя прыгажосць і экзатычнасць Венецыі. У сучаснікаў Францішка Сапегі засталіся ў памяці яго меркаванні пра наведаныя мясціны: «… у Пецярбургу … было захаладна, у Партугаліі засыра, у Англіі … дакучалі туманы, у Вільні не было блізкіх сяброў, у Варшаве … не меў з кім перакінуцца ў карты. І толькі ў Парыжы і ў Дзярэчыне … ніколі не сумаваў, знаходзіў, як і з кім бавіць час» [5].

Асоба Францішка Сапегі ўвасобіла як ліцвінскі патрыятызм, так і сармацкія ідэалы. Ён быў адданым сынам сваёй зямлі, пры гэтым спускаў вялікія багацці, здабытыя цяжкой працай яго падданых сялян, на задавальненне сваіх прыхамацяў. У сваіх паводзінах пры складаным выбары ён умеў кіравацца і цвярозым разлікам, і палітычным прадбачаннем. Зразумелым становіцца факт яго сяброўства з Тадэвушам Касцюшкам і прыязныя адносіны з царом Паўлам І, і тое, што насіў эпалеты генерала літоўскай артылерыі, меўшы ранг расейскага тайнага саветніка. За сваё жыццё Францішак Сапега паспеў праявіць сябе ў палітычнай, ваеннай, грамадскай, эканамічнай дзейнасці, зарэкамендаваў сябе знаўцам мастацтваў (сабраў велізарную калекцыю старадрукаў і жывапісных палотнаў) і вялікім авнтурыстам. А галоўнае – патрыётам сваёй Бацькаўшчыны.

Нялёгкім быў лёс яго сына Яўстаха Каятана Сапегі (7 жніўня 1797, Веркі каля Вільні – 16 лістапада 1860). Як і бацька, ён актыўна браў удзел у нацыянальна-вызваленчым паўстанні 1830 г. Князь жыў у Англіі ў графстве Лянкашыр, меў гра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мадзянства, здолеў захаваць тытул князя, што было выключэннем у брытанскім прававодстве. Пасля няўдалых родаў памірае жонка Мары Патэн Больд. Пачуўшы пра паўстанне, Яўстах вяртаецца на Радзіму і змагаецца ў рангу падпаручніка пры генерале Яне Скрынецкім. Дапамагае паўстанцам і грашыма (прадае Ружанскі маёнтак). За мужнасць і гераізм Сапега быў узнагароджаны Залатым Крыжам Віртуці Мілітары. Думаецца, што ў гэты час ён наведвае і Дзярэчын як паўнапраўны гаспадар.

Пасля паражэння паўстання Яўстах Сапега, разумеючы жахлівыя наступствы, разам са сваімі паплечнікамі пакідае Радзіму. Спачатку ён эмігрыруе ў Англію, а потым у Францыю, дзе настала пасяляецца пад Парыжам у гарадку Бяланкурт.

Сапега вымушаны быў нанова ладзіць сваё жыццё на чужыне. Ён спрабуе займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю: з Людвікам Ельскім князь засноўвае фінансава-прамысловае таварыства, стварае банк. Не ўсё атрымоўваецца. Даходзіць нават да банкруцтва. Дзякуючы вялікім намаганням усё ж удаецца паправіць матэрыяльнае становішча. Сапега заўсёды быў апорай для сваіх суайчыннікаў. Яго банк дапамагаў эмігрантам. Разам з аднадумцамі Яўстах Сапега назапашвае сродкі для барацьбы за свабоду Бацькаўшчыны, аднак лёс распараджаецца па-свойму. Князь не здолеў дажыць да паўстання Кастуся Каліноўскага. Ён памёр 16 лістапада 1860 г. у Парыжы і пахаваны на Манмартры.

Князь Яўстах Каятан Сапега застанецца ў памяці нашчадкаў як адданы сын сваёй зямлі. Пасля паражэння шляхецкага паўстання ён не стаў прасіць літасці ў цара Мікалая I, застаўся верны сваім ідэалам. А яшчэ быў і прыклад бацькі, які здолеў захаваць свае ўладанні, аднак не знайшоў спакой. Маёнткі Сапегаў, у тым ліку і Дзярэчын, былі секвестраваныя царом. Усё, што можна было вывезці з уладанняў Яўстаха, новыя гаспадары вывезлі: спачатку ў Гародню і Беласток, а потым – у Пецярбург. Імператар Мікалай I уласнаручна перабіраў нарабаванае дабро. У Эрмітаж былі дастаўлены 25 скрыняў з карцінамі, эстампамі, мазаікамі і кнігамі. Артэфакты з 18 скрыняў былі выстаўлены ў Эрмітажы, антыкварную зброю перадалі ў Анічкаўскі палац, а кнігі з астатніх 8 – аддадзены

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў Імператарскую публічную бібліятэку, толькі залаты крыж Сапегаў быў уручаны дзярэчынскай праваслаўнай царкве. Наступная партыя (37 скрыняў) нарабаваных каштоўнасцей прыбывае ў Пецярбург з Дзярэчына праз два гады. Цар загадаў спаліць карціны з сюжэтамі на гістарычныя тэмы. У нябыт імкнуліся выкінуць былую веліч Рэчы Паспалітай.

Толькі «…з Дзярэчына карцінаў і каштоўных упрыгожанняў было вывезена 303 пуды 25 фунтаў» [5], каля дзясятка старадаўніх гадзіннікаў з боем. Рабавалі ўсё, што бачылі: зброю, мэблю, посуд, падушкі, адзенне, бялізну. Копіі вопісаў сканфіскаваных рэчаў «…складаюць 124 старонкі дробным канцылярскім почыркам» [5].

Памяць пра князя Яўстаха Сапегу жыве ў беларусаў і сёння. Даведаўшыся пра яго смерць у Парыжы ў 1861 г., жыхары Дзярэчына адправілі ў касцёле жалобную імшу. У сучасным касцёле ўдзячныя нашчадкі ўсталявалі мемарыяльную дошку ў гонар Яўстахія Каятана Сапегі як уладара Дзярэчына і ўдзельніка нацыянальна-вызвольнага паўстання 1830–1831 гг.

Адным з апошніх прадстаўнікоў роду Сапегаў з'яўляецца Яўстах (Астап) Севярын Сапега, які 56 гадоў пражыў у Кеніі ў Найробі. Князь паходзіць з ружанскай лініі. Ягонай маці была князёўна Тэрэза Любамірская, якая ў 1909 г. выйшла замуж за Яўстафія Каэтана Уладзіслава Сапегу (1881–1963). Бацька Яўстаха ў міжваенны перыяд быў першым польскім паслом у Вялікабрытаніі, а ва ўрадзе прэм'ера Грабскага – міністрам замежных справаў. Давялося пабываць яму на Лубянцы, дзе быў прысуджаны да пакарання смерцю, але прысуд не быў выкананы. У час пасляваенных блуканняў былы польскі міністр, каб пракарміць сям'ю, вымушаны быў займацца свінагадоўляй у Афрыцы.

Нарадзіўся Астап у 1916 г. у Спушы каля Гародні. Вучыўся ў сярэдняй школе ў Пшчыне (горад па поўдні Польшчы) у Вацлава Іваноўскага (міністр асветы БНР з верасня па снежань 1918), потым у школе падафіцэраў рэзерву кавалерыі (Грудзендз, Польшча). У званні ўзводнага падхарунжага праходзіў службу ў 2-ім Палку грахоўскіх уланаў у Сувалках. Набываў адукацыю потым у Вышэйшай гандлёвай школе, Вышэйшай каланіяльнай школе ў Антверпене.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У верасні 1939 г. змагаўся супраць немцаў у складзе Сувальскай брыгады кавалерыі ў званні падпаручніка кавалерыі. Быў узнагароджаны Крыжам Храбрых. Змагаўся пад Візнай. Вайну закончыў на бітве пад Коцкам. Там па загадзе генерала Клеберга жаўнеры склалі зброю. Пасля вераснёўскага паражэння трапіў у лагер для ваеннапалонных у Нямеччыне. Перад прыходам Чырвонай Арміі вымушаны быў уцякаць з братам Львом, каб пазбегнуць рэпрэсій як сынам польскага палітыка. У Грабах разам з польскімі ваеннапалоннымі захапіў стайні з крадзенымі немцамі коньмі.

У 1948 г. разам з жонкай Антоніяй Марыяй Сяменскай выехаў у Афрыку, дзе і застаўся жыць разам з бацькам. Шмат прыходзілася працаваць, бо ўсё багацце роду было страчана. Князю прыйшлося стаць і жывёлаводам, гандляром драўніны і металалому, шукаць каштоўныя камяні, займацца арганізацыяй паляванняў-сафары. Памяць пра радзіму, пра свой род не пакідала Яўстафія. Ён стаў пісаць пра гісторыю родавых маёнткаў Сапегаў. У 1995 г. выдаў манаграфію гісторыі роду Сапегаў «Сапежынскі дом», аўтабіяграфію «Так было, або Недэмакратычныя ўспаміны Яўстаха Сапегі», у сааўтарстве кнігу «Сафары. Паляваньне ва Ўсходняй і Паўднёвай Афрыцы». Яўстафій Севярын жыў у Найробі да самай сваёй смерці 2 сакавіка 2004 г. Прах нябожчыка 31 ліпеня 2004 г. быў пахаваны ў парафіяльным касцёле ў Боцьках (мусіць, маецца на ўвазе вёска Боцькі на Падляшшы).

Напрыканцы жыцця Яўстах Сапега пабываў на радзіме, наведаў і Дзярэчын. Князя сустракалі вельмі сардэчна. І хаця нічога не захавалася ад Дзярэчынскага палаца, дамініканскага кляштара, дух Сапегаў жыве на гэтай зямлі. Спадар Яўстах размаўляў на беларускай мове і ўвесь час падкрэсліваў, што яго род не з Кароны, а з ВКЛ, што Сапегі – палякі, але яны беларусы. Як самы кранальны ўспамін пра сваю зямлю ён павёз у Афрыку запісаныя гукі касцёльнага звона, на якім напісана: «За памерлых Пана Бога просіць і хвалу Богу ўздае». … «Fecit me Ioannes Tomaszewicz» («Мяне зрабіў Ян Тамашэвіч»)» [5].

Унёсак князёў Сапегаў у гісторыка-культурную спадчыну Беларусі вельмі значны. Неабходна аддаць належнае іх духоў-



РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

насці, мастацкаму густу і нацыянальна арыентаванай грамадзянскай пазіцыі.

*1.* ARCHE. – 2016. – № 3. – 474 с.

*2. Габрусь, Т.* Мураваныя скарбы Сапегаў / Т. Габрусь // Наша вера. – 2000. – № 2 (12). – Рэжым доступу: http://media.catholic.by/nv/n12/art9.htm.

*3.* Гісторыя Сапегаў: жыццяпісы, маёнткі, фундацыі. – Мінск : Выд. Віктар Хурсік, 2017. – 586 с.

*4. Скобла, М.* Дзярэчынскі дыярыюш / М. Скобла. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1999. – 270 с.

*5. Скобла, М.* Мястэчка Дзярэчын / М. Скобла // Наша вера. – 1999. – № 3. – Рэжым доступу: http://media.catholic.by/nv/n9/art11.htm.

*6. Сліж, Н.* Дзярэчын: ад маёнтка да графства (XVI – першая палова XIX ст.) / Н. Сліж // ARCHE. – 2016. – № 3. – С. 351–391.

*7. Соркіна, І.* Мястэчкі Зэльва і Дзярэчын у святле архіўных звестак / І. Соркіна // Славуты Зэльвенскі край : матэрыялы навук. гісторыка-краязнаўчай канф. – Ліда, 2004. – С. 87–97.

*8. Чарняўскі, М. М.* Пры сутоках Шчары, Зяльвянкі і Нёмана / М. М. Чарняўскі // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Мастоўскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 21–28.

К. Г. ГЛУШКО

## ВОССТАНОВЛЕНИЕ И РАЗВИТИЕ ОБЪЕКТА КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ «РУЖАНСКИЙ ДВОРЦОВЫЙ КОМПЛЕКС РОДА САПЕГ»

Дворцовый комплекс рода Сапег в г. п. Ружаны – один из величественных дворцовых комплексов XVII–XVIII вв. на территории современной Беларуси, который являлся главной резиденцией рода Сапег.

Ранняя история поселка в основном связана с Сапегами – крупнейшим магнатским родом Великого Княжества Литовского и Речи Посполитой. Основное строительство Ружан как частновладельческого города велось в XVI–XVIII вв. Княжескую резиденцию и поселок разделял парк. На центральной рыночной площади были построены костел, униатская церковь

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ